# Маразуля
## (танец-песня XV ст.)

*Пераклад на беларускую мову З. Сасноўскага*




*Са мной танцуйце коламі*
*І будзеце ўсе роўнымі,*
*Свяціце ноч паходнямі*
*З паненкаю старой.*
*Ці рана, а ці позна вы*
*Здаровыя ці хворыя*
*Апошню ноч пад зорамі*
*Сустрэнеце са мной.*

*Скачыце, грэшнікі мае,*
*Хай смутак вас паабміне,*
*Шукайце ісціну ў віне,*
*Ганіце прэч спакой!*
*Танцуйце як апошні раз,*
*Жыцця прамень каб не пагас!*
*Хто спыніцца – сканае ўраз,*
*Зарублены касой!*

Copyright © Stary Olsa